Супрацоўнікі віталі сваіх гасцей на роднай мове,
удзельнікі ўзгадвалі, якія яшчэ ёсць ветлівыя словы ў нашай мове. Падчас мерапрыемства разам чыталі небыліцы, дзівосы, адгадвалі загадкі, слухалі жарты, знаёміліся з беларускімі гульнямі, прыказкамі, прымаўкамі, працавалі перакладчыкамі. Вельмі парадавала, што рабяты былі зацікаўлены дзіцячымі кнігамі, уважліва слухалі апавяданні В. Хомчанкі “Яблык” і І. Муравейкі “Яблыкі для сястрычкі”, беларускія казкі. Пазнаёміліся з цікавымі з’явамі прыроды і незвычайнымі прыгодамі зверанят.

